Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
___________ Ю. П. Бондар
«___» _________ 2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___/ баз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная),*
*спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

Мінск
БДУКМ
2016

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*І. М. Шумская,* дацэнт кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт;

*Г. Ф. Бядуліна,* дацэнт кафедры эканамічнай сацыялогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт», кандыдат сацыялагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 21.01.2015);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 12.03.2015)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. І. Смолік

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У якасці важнейшай атрыбутыўнай прыкметы крэатыўнай навуковай эліты на інфармацыйна-кагнітыўным узроўні звычайна вызначаецца наяўнасць істотных дасягненняў у галіне назапашвання новых ведаў, якія прызнаюцца навуковай супольнасцю. За апошнія два дзесяцігоддзі ў галіне тэорыі і гісторыі культуры беларускімі культуролагамі дасягнуты значныя вынікі. Сфарміравалася айчынная культуралогія як навуковая і вучэбная дысцыпліна і ўжо заняла трывалае месца ў сістэме гуманітарных ведаў. У многіх установах вышэйшай адукацыі краіны вядзецца бесперапынная культуралагічная адукацыя. Беларускімі навукоўцамі выдадзена нямала падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, вучэбна-метадычных комплексаў, аўтары якіх знаёмяць студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў з разнастайнасцю культурных феноменаў, створаных чалавецтвам.

У перыяд сістэмнай мадэрнізацыі беларускага грамадства ўзрастае роля культуралогіі як навукі, што вывучае, плануе і распрацоўвае методыку мэтанакіраванага прагназавання, кіравання працэсамі фарміравання індывіда і яго пераўтварэння з чалавека разумнага, што валодае тэхналогіяй вытворчасці, у чалавека творчага, які паўсядзённа ўвасабляе высокія крытэрыі культуры ва ўсіх сферах жыццядзейнасці. Вывучэнне і фарміраванне прынцыпаў і тэхналогій мэтанакіраванага рэгулявання культурнымі працэсамі, арганізацыя дзейнасці асобы ў сферы культуры складаюць змест спецыяльнай галіны навуковага пазнання – прыкладной культуралогіі. У сувязі з гэтым паўстала неабходнасць увядзення ў вучэбныя планы па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках) вучэбнай дысцыпліны «Культуралагічная адукацыя», дзе б асэнсоўвалася спецыфіка функцыянавання культуры ў грамадстве, сацыякультурныя працэсы, якія адбываюцца ў розных сацыяльных групах, супольнасцях, а таксама характарызуюць унутраны свет асобы, праблемы тэорыі і методыкі інстытуцыяльных і пазаінстытуцыяльных узаемадзеянняў суб'ектаў культуры, формы і тэхналогіі фарміравання культуры асобы.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – фарміраванне ў будучых выкладчыкаў культуралагічных дысцыплін цэласнага ўяўлення аб станаўленні і развіцці шматгаліновай сістэмы культуралагічнай адукацыі, яе структуры, задачах і функцыях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– садзейнічаць асэнсаванню месца і ролі культуралагічнай адукацыі ў сацыякультурным станаўленні, самаідэнтыфікацыі, інтэлектуальнай дзейнаснай самаарганізацыі сучаснай асобы;

– выявіць сацыяльныя і культурна-гістарычныя ўмовы станаўлення і дынамікі культуралагічнай адукацыі ў заходнееўрапейскіх краінах;

– паказаць адметнасці працэсу ўзнікнення культуралагічнай адукацыі ў Беларусі;

– выдзяліць і ахарактарызаваць узроўні і структуру бесперапыннай культуралагічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь;

– абазначыць змест і формы вучэбна-метадычнага забеспячэння культуралагічнай адукацыі, створанага беларускімі і замежнымі педагогамі.

У выніку вывучэння дадзенай вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– ступень эфектыўнасці культуралагічнай адукацыі ў сацыялізацыі і інкультурацыі асобы;

– сутнасць і змест культуралагічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і іншых краінах свету;

– гістарычныя і сучасныя ўзроўні і формы культуралагічнай адукацыі;

– праблемы і шляхі павышэння эфектыўнасці культуралагічнай адукацыі;

– вучэбна-метадычнае забеспячэнне выкладання культуралагічных дысцыплін.

Студэнты павінны *ўмець:*

– паказаць вытокі культуралагічнай адукацыі;

– абазначыць спецыфіку працэсу станаўлення і развіцця культуралагічнай адукацыі ў Беларусі;

– ахарактарызаваць змест, узроўні і формы сучаснай культуралагічнай адукацыі;

– выкарыстоўваць патэнцыял культуралагічнай адукацыі для фарміравання прафесійнай і асобаснай кампетэнтнасці будучых спецыялістаў сацыякультурнай сферы.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Культуралагічная адукацыя» ўсяго прадугледжана 58 гадзін, з якіх 34 гадзіны – аўдыторныя заняткі (20 гадзін – лекцыі, 14 гадзін – семінары).

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | лекцыі | семінар. заняткі |
| Уводзіны | 1 | – |
| *Тэма 1.* Культурна-гістарычныя перадумовы станаўлення і развіцця культуралагічнай адукацыі | 1 | – |
| *Тэма 2.* Духоўна-рэлігійны кантэкст адукацыі ў ВКЛ у перыяд Сярэдневякоўя | 2 | 2 |
| *Тэма 3.* Фарміраванне свецкай адукацыі і пашырэнне яе культуралагічнага зместу ў Новы час | 2 | 2 |
| *Тэма 4.* Універсітэт як прынцыпова новая з'ява еўрапейскага інтэлектуальнага жыцця | 2 | 1 |
| *Тэма 5.* Далейшае развіццё гуманітарнай адукацыі ў 2-й палове XIX – пачатку XX ст. | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Фарміраванне сістэмы нацыянальнай культуралагічнай адукацыі ў 1-й палове XX ст. | 2 | 2 |
| *Тэма 7.* Культуралагічная адукацыя як інтэлектуальная тэндэнцыя 2-й паловы XX ст. | 2 | 1 |
| *Тэма 8.* Структураванне культуралагічных ведаў | 2 | 1 |
| *Тэма 9.* Сучасная сістэма бесперапыннай культуралагічнай адукацыі | 2 | 1 |
| *Тэма 10.* Фарміраванне культурарыентаванага асяроддзя сучаснай сістэмы культуралагічнай адукацыі | 2 | 2 |
| **Усяго…** | **20** | **14** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Адукацыя як сродак сацыякультурнага ўзнаўлення супольнасці, павышэння патэнцыялу яе адаптыўных магчымасцей і перспектыў культурнага развіцця. Асноўныя сацыякультурныя функцыі адукацыі, у тым ліку культуралагічнай. Традыцыйны падзел адукацыі: агульнае, спецыялізаванае (прафесійнае). Адметнасці прафесійнай адукацыі. Мэта і задачы адукацыі. Сутнасць культуралагічнай адукацыі як сацыякультурнага працэсу.

### *Тэма 1. Культурна-гістарычныя перадумовы станаўлення і развіцця культуралагічнай адукацыі*

Узнікненне пісьменнасці ў старажытных цывілізацыях і яе ўплыў на развіццё адукацыі. Арыентацыя адукацыі на падрыхтоўку свабодных грамадзян, здольных удзельнічаць у сацыякультурным жыцці поліса ў Старажытнай Грэцыі. Старажытнарымская сістэма адукацыі. Антрапацэнтрычная накіраванасць антычнай сістэмы адукацыі.

Уплыў хрысціянства на змест і функцыі адукацыі. Тэацэнтрычны кірунак адукацыі.

Фарміраванне свецкай адукацыі ў эпоху Адраджэння. Гуманістычны характар адукацыі ў Новы час.

Адукацыя і выхаванне як асноўныя сродкі пабудовы новага еўрапейскага грамадства.

Адукацыя як магутны фактар развіцця сучаснай культуры.

### *Тэма 2. Духоўна-рэлігійны кантэкст адукацыі ў ВКЛ у перыяд Сярэдневякоўя*

Біблія і грэка-візантыйская філасофія як ідэйна-тэарэтычная аснова сярэдневяковай адукацыі. Царкоўныя, саборныя і манастырскія школы і іх роля ў фарміраванні духоўнасці чалавека. Гільдзейскія, цэхавыя, муніцыпальныя і прыватныя школы як праобраз свецкай адукацыі. Сем вольных мастацтваў – прыступка да авалодання тэалогіяй.

Духоўны ўплыў Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага на развіццё адукацыі на землях Беларусі. Пашырэнне пісьменнасці на тэрыторыі Беларусі.

Рукапісныя кнігі як асноўная крыніца ведаў. Узнікненне еўрапейскіх універсітэтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 3. Фарміраванне свецкай адукацыі і пашырэнне яе культуралагічнага зместу ў Новы час*

Асэнсаванне каштоўнасці асобы чалавека ў адукацыі ў перыяд Рэнесансу. Агульнадаступнасць адукацыі ў брацкіх школах. Трывіум і квадрыум – дзве ступені адукацыі. Стварэнне першых свецкіх падручнікаў М. Сматрыцкім і Л. Зізаніем. Брацкія школы ў Беларусі.

Змест класічнай гуманітарнай адукацыі ў калегіумах. Ступені гуманітарнай адукацыі (infima classic, media gramaticas, suprema classic, clas humanitas). Калегіумы ў Беларусі.

Пераўтварэнне калегіумаў у акадэміі. Структура акадэмій: факультэт філасофіі, факультэт тэалогіі. Культурфіласофскі змест акадэмічнай адукацыі. Асветніцкая дзейнасць Віленскай, Гродзенскай і Полацкай акадэмій.

Галоўная школа як узор свецкай гуманітарнай адукацыі. Маральны, фізічны і медыцынскія факультэты. Культуралагічны модуль у вучэбных планах Галоўнай школы.

*Тэма 4. Універсітэт як прынцыпова новая з'ява еўрапейскага інтэлектуальнага жыцця*

Узнікненне і развіццё ўніверсітэтаў у краінах Заходняй Еўропы. Дэмакратычны статус універсітэтаў. Традыцыйныя факультэты ўніверсітэтаў.

Пераўтварэнне Галоўнай школы ў Віленскі ўніверсітэт. Універсітэт як асяродак тагачаснай культуралагічнай адукацыі. Факультэты ўніверсітэта: маральных і палітычных навук, фізіка-матэматычны, медыцынскі, літаратурны і вольных мастацтваў. Навуковая, грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць прафесараў і студэнтаў Віленскага ўніверсітэта (І. Анацэвіч, М. Баброўскі, І. Лялевель, Я. Снядзецкі, Т. Зан, А. Міцкевіч, Я. Чачот і інш.). Інстытуты ўніверсітэта.

*Тэма 5. Далейшае развіццё гуманітарнай адукацыі ў 2-й палове XIX – пачатку XX ст.*

Фарміраванне індустрыяльнага грамадства як выклік адукацыі. Узнікненне гімназій. Засваенне матэрыяльнай культуры ў Горы-Горацкім універсітэце.

Рух за стварэнне нацыянальнай беларускай школы. Этнакультурныя даследаванні прафесараў і выпускнікоў вышэйшай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

школы (Я. Карскі, М. Нікіфароўскі, Я. Раманаў, К. Тышкевіч, П. Шпілеўскі і інш.).

Адкрыццё настаўніцкіх семінарый. Фарміраванне сістэмы мастацкай адукацыі.

*Тэма 6. Фарміраванне сістэмы нацыянальнай культуралагічнай адукацыі ў 1-й палове XX ст.*

Асноўныя тэндэнцыі сацыякультурнага развіцця постындустрыяльнага грамадства і іх уплыў на сутнасць і змест культуралагічнай адукацыі. Станаўленне культурнай антрапалогіі ў краінах Заходняй Еўропы і ЗША.

Інстытут беларускай культуры і яго роля ў развіцці айчыннай культуралогіі. Адкрыццё Акадэміі навук Беларусі.

Падрыхтоўка кадраў сферы мастацкай культуры. Студыі Карафа-Корбут і Сямашкі. Віцебская народная мастацкая школа. Віцебскі мастацкі тэхнікум. Народныя кансерваторыі. Беларускі дзяржаўны тэхнікум сцэнічнага мастацтва. Беларуская дзяржаўная кансерваторыя. Рэспубліканскае тэатральнае вучылішча. Беларускі дзяржаўны тэатральны інстытут.

Фарміраванне нацыянальнай сістэмы гуманітарнай адукацыі. Адкрыццё Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Стварэнне Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі і яго дзейнасць па вывучэнні мастацкай культуры.

*Тэма 7. Культуралагічная адукацыя як інтэлектуальная тэндэнцыя 2-й паловы XX ст.*

Ідэйна-метадалагічны крызіс у гуманітарных і грамадскіх навуках. Фарміраванне новага даследчага кірунку – культуралогіі ў гуманітарыстыцы на постсавецкай прасторы. Культуралогія як інтэграваныя веды аб культуры і грамадстве.

Узрастанне ролі культуралагічных ведаў у перыяд сістэмнай трансфармацыі грамадства (1980–1990-я гг.). Актывізацыя навукова-педагагічнай дзейнасці па вывучэнні агульных праблем фундаментальнай культуралогіі.

Перабудова сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтваў. Падрыхтоўка спецыялістаў-культуролагаў, сацыяльна-культурных работнікаў у адпаведнасці з новай адукацыйнай парадыгмай. Абгрунтаванне навуковай легітымнасці розных галін культуралогіі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 8. Структураванне культуралагічных ведаў*

Развіццё розных напрамкаў культуралагічнай адукацыі. Фундаментальная культуралогія як сукупнасць сістэмных ведаў, якія вызначаюць паняцці і катэгорыі, асноватворныя метады і прынцыпы, агульнанавуковыя падыходы да прадмета культуралогіі.

Вывучэнне гістарычнай культуралогіі гісторыі цывілізацыі і культуры з пазіцый культуралагічнай метадалогіі і метадаў пазнання.

Прыкладныя кампаненты культуралогіі. Структура і тэматызацыя прыкладных культуралагічных ведаў.

Культуралогія музейнасці. Культуралогія моды. Педагагічная культуралогія. Гендарная культуралогія.

*Тэма 9. Сучасная сістэма бесперапыннай культуралагічнай адукацыі*

Адукацыйны комплекс айчыннай галіны культуры як цэласная шматузроўневая сістэма. Гістарычная перыядызацыя развіцця сацыякультурнай прафесійнай адукацыі: а) 1918–1941 гг.; б) 1944–1975 гг.; в) 1976–1990-я гг. Шляхі ўмацавання творчых і навукова-метадычных рэсурсаў адукацыі ў сацыякультурнай сферы. Дынаміка змяненняў прафесійна-адукацыйнага ўзроўню спецыялістаў культуры.

Набыццё і паглыбленне сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці ў працэсе бесперапыннай адукацыі. Узроўні ўскладнення адукацыйнай і творчай дзейнасці будучых спецыялістаў сферы культуры і іх змест: 1) прафесійна-арыентацыйны; 2) прафесійны сярэдні; 3) прафесійны вышэйшы; 4) майстэрства і самасцвярджэння.

Адметныя асаблівасці бесперапыннай культуралагічнай адукацыі: адукацыя ажыццяўляецца на эмацыянальна-псіхалагічным асваенні свету і развіцці творчых задаткаў асобы; неабходнасць ранняга прафесійнага адбору моладзі на падставе выяўлення іх прыродных здольнасцей; забеспячэнне бесперапыннай паслядоўнасці прырашчэння прафесіяналізму; развіццё ўменняў і навыкаў асэнсавання культуратворчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 10. Фарміраванне культурарыентаванага асяроддзя сучаснай сістэмы культуралагічнай адукацыі*

Пераход ад тэхнакратычнай да культурна-гуманітарнай канцэпцыі фарміравання асобы спецыяліста сацыякультурнай сферы. Тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да пабудовы мадэлі культурадпаведнага адукацыйнага асяроддзя: дзейнасны, анталагічны, функцыянальны, акадэмічны.

Сутнасць наасфернай парадыгмы вышэйшай прафесійнай адукацыі. Акцэнт на духоўныя каштоўнасці і творчыя формы культуры. Актывізацыя асобаснага фактару як важнейшая мэта культуралагічнай адукацыі. Пераарыентацыя цэнтралізаванай культуралагічнай адукацыі на адкрытую для інавацый. Стандартызацыя культуралагічнай адукацыі.

Праграмныя дакументы развіцця сістэмы культуралагічнай адукацыі Рэспублікі Беларусь. Адукацыйныя стандарты, вучэбныя планы і праграмы па фундаментальнай і прыкладной культуралогіі.

Асноўныя ідэі кампетэнтнаснага падыходу да падрыхтоўкі кадраў сферы культуры. Кампетэнтнасць як інтэграваная якасць асобы спецыяліста сацыякультурных устаноў. Кампетэнтнасць як сацыяльна-дыдактычная структура асобы спецыяліста ў сферы культуры. Асобасная кампетэнтнасць у структуры мадэлі спецыяліста сацыякультурнай сферы.

Вучэбна-метадычнае забеспячэнне культуралагічнай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*1. Ариарский, М. А.* Педагогическая культурология : в 2 т. / М. А. Ариарский. – СПб. : Концерт, 2012. – 2 т.

*2.* Государственная программа развития высшего образования на 2011–2015 годы: утв. постановлением Совета Министров Респ. Беларусь, 1 июля 2011 г., № 893 // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Минск, 2003. – URL: http // pravo. by.

*3. Грыгаровіч, Я. Д.* Падрыхтоўка кадраў культуры ў Рэспубліцы Беларусь: сучасны стан і перспектывы / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік, А. М. Рагачова. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 2001. – 158 с.

*4. Грыгаровіч, Я. Д.* Культуралагічная адукацыя як аснова фарміравання спецыяліста сацыяльна-культурнай сферы / Я. Д. Грыгаровіч // Прыкладная культуралогія: вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці «Культуралогія» ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – С. 197–215.

*5. Жук, О. Н.* Компетентностный подход в высшем профессиональном образовании / О. Н. Жук // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 12. – С. 41–48.

*6. Зеер, Э. Ф.* Модернизация профессионального образования: компетентностный подход / Э. Ф. Зеер // Образование и наука. – 2004. – № 3 (27). – С. 42–53.

*7.* Кодекс Республики Беларусь об образовании // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Минск, 2003. – URL. http // pravo. by.

*8. Кошель, Н. Н.* Профессиональная компетентность как базовая категория последипломного образования / Н. Н. Кошель // Адукацыя і выхаванне. – 2005. – № 9. – С. 8–14.

*9.* Культурологическое образование: комплексная учеб. программа с метод. рекомендациями по культурол. дисциплинам / Рос. гос. пед. ун-т им. А. Н. Герцена. – СПб., 1998. – 312 с.

*10.* Образовательный стандарт «Высшее образование. Первая ступень. Цикл социально-гуманитарных дисциплин» (утвержден и введен в действие постановлением М-ва


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

образования Респ. Беларусь от 01.09.2006, № 89). – Мінск, 2006. – 26 с.

*11. Скараходаў, У. П.* Нацыянальная сістэма адукацыі ў галіне культуры (сацыялагічны аспект) / У. П. Скараходаў // Сацыядынаміка культуры сучаснай Беларусі / навук. рэд. А. Я. Міхневіч. – Мінск : БелДІПК, 2003. – С. 189–203.

*12. Смолік, А. І.* Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы культуралагічнай адукацыі ў ВНУ культуры і мастацтваў / А. І. Смолік // Сацыяльна-гуманітарныя навукі ў сістэме вышэйшай школы: матэрыялы навук.-метад. канф., 5–6 лют. 2002 г. / рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры, 2003. – С. 194–201.

*13. Хуторской, А. В.* Ключевые компетенции как компонент личностно-ориентированной парадигмы образования / А. В. Хуторской // Нар. образование. – 2003. – № 2. – С. 58–64.

*Дадатковая*

*1. Вербицкий, А. А.* Новая образовательная парадигма и контекстное обучение: моногр. / А. А. Вербицкий. – М. : Исследов. центр проблем качества подготовки специалистов, 1999. – 75 с.

*2. Вішнеўскі, М.* Пытанні аптымізацыі сацыяльна-гуманітарнай адукацыі ў ВНУ / М. Вішнеўскі // Вышэйшая школа. – 2011. – № 6. – С. 19–22.

*3. Жук, А. И.* Новое качество социально-гуманитарной подготовки выпускников высших учебных заведений / А. И. Жук // Вышэйшая школа. – 2011. – № 9. – С. 12–17.

*4. Зенькова, И. В.* Программа согласования системы высшего (среднего специального) образования и системы «рынок труда» / И. В. Зенькова // Вестн. Полоцкого гос. ун-та. Сер. Д. Экономические и юридические науки. Экономика и управление. – 2008. – № 10. – С. 34–40.

*5. Зимняя, Н. А.* Общая культура и социально-профессиональная компетентность человека / Н. А. Зимняя // Профессиональное образование. – 2006. – № 2.– С. 18–21.

*6.* Культура Беларуси: 20 лет развития (1991–2011): моногр. / С. П. Винокурова [и др.] ; под общ. ред. О. А. Галкина, И. Г. Голубевой. – Минск : Ин-т культуры Беларуси, 2012. – 332 с.

*7. Кузьмініч, М. Л.* Мастацкая творчасць: універсітэцкая падрыхтоўка кадраў: вучэб. дапам. / М. Л. Кузьмініч. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 142 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*8. Макараў, А.* Кампетэнтнасная мадэль сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі выпускніка ВНУ / А. Макараў // Вышэйшая школа. – 2004. – № 1.– С. 16–21.

*9. Сцепанцоў, А. І.* Сістэма бесперапыннай адукацыі ў галіне культуры / А. І. Сцепанцоў // Мастац. адукацыя і культура. – 2004. – № 3. – С. 13–19.

*10. Ушакова, В. М.* Теория и практика разработки содержания вузовского образования / В. М. Ушакова. – Минск : БГУКИ, 2011. – 222 с.

*11. Шимилевич, А. Г.* Компетентностно-ориентированный подход к организации учебной деятельности студентов при изучении истории изобразительного искусства / А. Г. Шимилевич // Культура. Наука. Творчество: VI Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 10–11 мая 2012 г.: сб. науч. ст. / М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; науч. ред. М. А. Можейко. – Минск : БГУКИ, 2012. – С. 275–279.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння праблем сацыякультурнай практыкі, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– праектныя тэхналогіі;
– камунікатыўныя тэхналогіі;
– гульнявыя тэхналогіі;
– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання неабходнай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці выпускніка УВА ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

У якасці аднаго з элементаў выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў магчыма выкарыстоўваць крытэрыяльна-арыентаваныя тэсты. Яны ўяўляюць сабой сукупнасць тэставых заданняў закрытай формы з адным альбо некалькімі варыянтамі правільных адказаў; заданняў на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі двух варыянтаў з адным альбо некалькімі суадносінамі і аднолькавай альбо рознай колькасцю элементаў і варыянтаў; заданняў адкрытай формы з фармалізаваным адказам; заданняў на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці.

Для вызначэння адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнтаў па патрабаваннях адукацыйнага стандарту таксама магчыма выкарыстоўваць праблемныя, творчыя заданні, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

## Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа скіравана на паглыбленне ведаў па дадзенай дысцыпліне і актывізацыю матываванай вучэбнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці, усебаковае засваенне вучэбнага матэрыялу. Самастойная работа студэнтаў уключае наступныя формы:

– падрыхтоўка да лекцый, семінарскіх заняткаў;

– вывучэнне дапаможнікаў;

– вывучэнне і канспектаванне дадатковай літаратуры па тэмах дысцыпліны;

– падбор тэкстаў адпаведнай тэматыкі для культуралагічнага аналізу;

– напісанне творчых прац у форме дакладаў, рэфератаў;

– стварэнне электронных прэзентацый па вывучаемых тэмах;

– заняткі ў бібліяграфічным аддзеле бібліятэкі па зборы матэрыялаў для дыскусій, напісання эсэ і г.д.

Для ацэнкі якасці самастойнай работы студэнтаў выкарыстоўваецца кантроль за яе выкананнем. Формы кантролю самастойнай работы: гутарка, праверка індывідуальных заняткаў і пісьмовых тэкстаў, кансультаванне студэнтаў па стварэнні мультымедыйных прэзентацый і падборы матэрыялаў для эсэ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная),*
*спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,93. Ул.-выд. арк. 0,57. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ